УДК УДК 726.6.033(476)

**Тамара ГАБРУСЬ**

# Да пытання гісторыка-архітэктурнай атрыбуцыі былога фарнага касцёла ў Гродна (Фары Вітаўта)

Артыкул прысвечаны ўдакладненню аўтарства і стылявых характарыстык шырока вядомага ў гісторыі архітэктуры Беларусі парафіяльнага касцёла ў горадзе Гродна, які знішчаны гарадскімі ўладамі ў 1961 г. Яго традыцыйная назва – "Фара Вітаўта" – сведчыць пра заснаванне святыні на мяжы XIV–XV ст. Першапачаткова драўляны касцёл адлюстраваны на гравюры Гродна 1567 г. Новы храм пастаўлены ў камені на месцы папярэдняга ў канцы XVI ст.на сродкі караля Рэчы Паспалітай Стафана Баторыя. На падставе калекцыі архіўных чарцяжоў з Украіны паказана, што аўтарам праекта гродненскага касцёла быў архітэктар-італьянец Д.-М. Бернардоні. Архітэктурны аналіз паказвае, што будынак касцёла спалучаў рысы мясцовай готыкі і рэнесанса.

*Ключавыя словы:* этнічная Літва, касцёл, фара Вітаўта, даты фундацый, калекцыя чарцяжоў, аўтар праекта, мясцовы архітэктурны рэнесанс

**Tamara Gabrus**

**On the issue of historical and architectural attribution of the former parish church in Grodno (the Vitautas parish church)**

The authorship and stylistic characteristics of the well-known in the history of Belarusian architecture parish church (Fara) in Grodno, which was destroyed by the city authorities in 1961 is clarified. Its traditional name – "Fara Vitauta" (The Vitautas Fara) – testifies to the founding of the shrine at the turn of the XIV–XV centuries. The wooden church was originally depicted in an engraving of Grodno of 1567. The new church was built in stone on the site of the previous one at the end of the 16th century at the expense of King of the Polish–Lithuanian Commonwealth Stephen Bathory. Based on a collection of archival drawings from the Ukraine, it is shown that the author of the project of the Grodno church was the Italian architect Giovanni Maria Bernardoni. Architectural analysis shows that the church building combined features of the local Gothic and Renaissance.

*Keywords:* ethnic Lithuania, church, Vitautas, dates of foundations, collection of drawings, author of the project, local architectural renaissance

**Тамара Габрусь**

**До питання історико-архітектурної атрибуції колишнього парафіяльного костелу в Гродні (Фари Вітовта)**

Статтю присвячено уточненню авторства і стильових характеристик широко відомого в історії архітектури Білорусі парафіяльного костелу в Гродні, знищеного міською владою 1961 р. Його традиційна назва – "Фара Вітаўта" – свідчить про заснування святині на рубежі XIV–XV ст. Первинний дерев'яний костел проілюстровано на гравюрі Гродна 1567 р. Новий кам'яний храм збудовано на місці попереднього в кінці XVI ст. коштом короля Речі Посполитої Стефана Баторія. На основі колекції архівних креслень з України показано, що автором проєкту Гродненської церкви був італійський архітектор Д.-М. Бернардоні. Архітектурний аналіз свідчить про те, що будівля костелу поєднувала риси місцевої готики та ренесансу.

*Ключові слова:* етнічна Литва, церква, маяк Вітовта, дати заснування, колекція малюнків, автор проєкту, місцевий архітектурний ренесанс

Абласны цэнтр Рэспублікі Беларусь горад Гродна (летапісны Городень, Городна, Городня) упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1128 г. як цэнтр удзельнага княства. У 1240 г. горад увайшоў у склад Вялікага Княства Літоўскага, а з 1253 г. па 1270-я гг. быў часова далучаны да Галіцка-Валынскага княства. На той час рэгіён Гродна вызначаецца гісторыкамі, археолагамі і этнографамі як Чорная Русь [16]. У XII ст. тут адначасова з развіццём шматлікіх рамёстваў і гандлю склалася рэгіянальная школа мураванага сакральнага дойлідства, якая вызначаецца своеасаблівымі архітэктурна-мастацкімі характарыстыкамі і будаўнічымі прыёмамі, генезіс якіх дастаткова складаны і да канца не выяўлены. Мураваныя праваслаўныя храмы Гродна старажытнарускага перыяду ацалелі часткова ці раскрыты археалагічнымі раскопкамі ў фрагментах: Ніжняя і Верхняя царквы на Замкавай гары, саборная царква Раства Багародзіцы (Прачысценская) на прызамкавым пасадзе і Барысаглебская царква ў прадмесці Каложа. Да азначанай рэгіянальнай гродзенскай школы дойлідства адносяцца таксама археаланічныя рэшткі мураваных праваслаўных храмаў у Ваўкавыску і Наваградку – першай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага да заснавання князем Гедымінам Вільні.

Пасля дзяржаўнага хрышчэння этнічнай Літвы ў каталіцтва ў 1387 г. на гэтых землях вялікім князем літоўскім Вітаўтам быў заснаваны шэраг каталіцкіх парафій з касцёламі, якія ў сувязі з гэтым атрымалі ў гісторыі назву “фара Вітаўта”. Палітычныя амбіцыі Вітаўта, саперніцтва з каралем Польшчы Ягайлам, імкненне да каралеўскай кароны, арыентацыя ў дзяржаўным жыцці на каталіцкае веравызнанне спрыялі заснаванню ім першага ў Гродне касцёла, дзе дагэтуль існавалі толькі праваслаўныя храмы. Касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Гродна, які рэальна, на жаль, ужо не існуе, з’яўляецца надзвычай важным помнікам сакральнага дойлідства Беларусі канца XVI ст. Яго традыцыйная назва – “фара Вітаўта” – сведчыць пра гістарычную даўніну і сацыяльную значнасць. Тэрмін “фара” азначае галоўны парафіяльны (прыхадскі) каталіцкі храм ў городзе. На працягу шасці стагоддзяў гэтая святыня ў розных сваіх іпастасях несла на сябе імя свайго заснавальніка – князя гарадзенскага, а затым вялікага князя літоўскага Вітаўта, пры якім Вялікае Княства дасягнула найбольшай магутнасці.

Фарны касцёл у Гродна заўжды прыцягваў увагу як важны этап у гісторыі станаўлення каталіцкай канфесіі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Вывучэннем гісторыі яго заснавання і будаўніцтва займаліся шматлікія даследчыкі гісторыі рэлігіі і культуры Вялікага Княства на працягу амаль 200 гадоў. Першапачаткова гэта былі польскамоўныя статыстычныя і энцыклапедычныя выданні па гісторыі каталіцкай канфесіі ў Рэчы Паспалітай, у якіх гістарычныя звесткі пра заснаванне святыні былі ў значнай ступені міфалагізаваны [1; 2; 3]. Паступова выяўляліся новыя гістарычныя крыніцы і ўдакладняліся навуковыя дадзеныя. Першым рускамоўным гісторыка-архітэктурным даследаваннем гэтага выдатнага помніка беларускага дойлідства, ужо пасля яго знішчэння гарадскімі ўладамі ў 1961 г., стала праца 1977 г. маскоўскай даследчыцы А. Квітніцкай, заснаваная на дакументах Літоўскай метрыкі [10]. За апошнія 40 гадоў яму прысвечана значная колькасць новых публікацый па выніках шматлікіх даследаванняў беларускіх і польскіх гісторыкаў, археолагаў, рэстаўратараў

і мастацтвазнаўцаў, што адкрываюць адну з самых каштоўных старонак гісторыі архітэктуры Беларусі перыяду Рэчы Паспалітай (Е. Пашэнда, А. Мілінкевіч, Т. Габрусь, А. Краўцэвіч, Ю. Гардзееў) [4; 6; 7; 8; 9; 11; 13].

У пытанні гісторыка-архітэктурнай атрыбуцыі фарнага касцёла Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Гродна неабходна улічваць некалькі розных складнікаў. Для даследчыкаў гісторыі рэлігіі найбольш важнай з'яўляецца дата заснавання каталіцкай парафіі і будаўніцтва першага касцёла, якая дакладна невядома. Доўгі час гісторыкі касцёла абапіраліся на архіўны прывілей гродзенскім яўрэям ад 1389 г., з якога вынікае, што касцёл у Гродна на той час ўжо існаваў. У грамаце ўпамінаюцца касцёльныя ўчасткі каталіцкія могілкі каля гарадскога рынку. Аднак, пазней атрымала пашырэнне меркаванне, што гэтая грамата з'яўляецца гістарычнай фальсіфікацыяй. У сучасных навуковых публікацыях заснаванне першага парафіяльнага касцёла ў Гродна датуецца атрыбутыўна 1392 г. – пачаткам праўлення. Пры тым, што аўтэнтычных архіўных дакументаў з дакладнай датай заснавання каталіцкай святыні ў Гродна не захавалася, у 600-гадовай гістарычнай рэтраспектыве гэтую падзею можна акрэсліць больш шырокім прамежкам часу ўсяго праўлення вялікага князя літоўскага Вітаўта (1392–1430).

Для гісторыкаў архітэктуры больш істотным з'яўляецца вызначэнне датаў узвядзення і шматлікіх рэканструкцый будынка фарнага касцёла на Старым рынку ў Гродна як пэўных этапаў эвалюцыі айчыннага манументальнага дойлідства. Усталявалася думка, што першы будынак касцёла быў драўляны, але далейшыя звесткі аб ім амаль да канца XVI ст. не стасуюцца адна з адной. З шэрагу крыніц гісторыка-краязнаўчага характару XIX – пачатку XX ст. вынікае, што мураваны фарны касцёл на месцы драўлянага пабудаваны ў 1494 г. па фундацыі караля Польшчы і вялікага князя літоўскага Аляксандра Ягелончыка, з другіх – у 1551 г. па фундацыі каралевы-італьянкі Боны, жонкі караля Жыгімонта І Старога. Але гэтыя даты не адпавядаюць рэаліям будаўніцтва мураванай фары, што выяўлена пазнейшымі даследаваннямі.

Месцазнаходжанне і арыентацыя ўсходняй алтарнай часткі касцёла сведчыць, што ён быў элементам дамагдэбургскай планіровачнай структуры горада [9, с. 80]. Першапачаткова касцёл выходзіў галоўным фасадам да колішняга Старога рынку, які склаўся на скрыжаванні тагачасных асноўных гандлёвых шляхоў – Віленскага і Смаленскага трактаў. На працягу XV ст. на ўсход ад прызамкавай часткі горада пачала фарміравацца новая сетка вуліц і плошчаў. Па меркаванню В. Рэвеньскай, пры гэтым Стары рынак быў забудаваны, а касцёл заняў амаль палову заходняга боку новага Ратушнага рынку паміж паміж Замкавай і Плябанскай вуліцамі [5, с. 59].

Па распараджэнню і на сродкі каралевы Боны ў сярэдзіне XVI ст. была рэканструявана драўляная фара. Гістарычнае месцазнаходжанне тагачаснай святыні зафіксавана каштоўнай графічнай крыніцай: "Сапраўдны выгляд Гродна, горада ў Літве". Малюнак выкананы з натуры ў 1567 г. нямецкім рысавальшчыкам Гансам Адэльхаўзерам і выгравіраваны вядомым нюрнбергскім залатых спраў майстрам, картографам і гравёрам Мацеям Цюндтам у 1568 г. (*іл. 1*). На гравюры горада на месцы фарнага касцёла дана выява прамавугольнага аднанефавага храма, арыентаванага алтаром на захад, з круглай ад аснавання вежай на паўднёва-ўсходнім вуглу. Над ім



*Іл. 1. Фара Вітаўта. З гравюры Гродна 1567 г. Рыс. Г. Адэльхаўзер. Гр. М. Цюндт*

надпіс на лаціне: "Месца святое польскае ў горадзе" [18, с. 39]. Аднак вызначыць па гравюры будаўнічы матэрыял фарнага касцёла немагчыма. Вырашыць гэтае пытанне дапамагае заўвага з пісьма караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя (гады праўлення 1576–1586) рэгіянальнаму кіраўніку ордэна езуітаў І. П. Кампана, што гродзенскі фарны касцёл "самы вялікі і самы цудоўны ў Вялікім Княстве Літоўскім, але драўляны" [4, с. 184].

На другой шырока вядомай графічнай выяве Гродна 1600 г. нясвіжскага картографа князёў Радзівілаў на азначаным "святым месцы" прадстаўлены зусім іншы будынак "фары Вітаўта", што сведчыць пра новы этап яе архітэктурнай гісторыі (*іл. 2*). Доўгі час лічылася, што мураваны фарны касцёл у Гродна пабудаваны на сродкі караля Стафана Баторыя ў 1579–1586 гг. Дакладныя звесткі пра архітэктара і будаўніка святыні адсутнічалі, было вядома толькі, што італьянец. Выказвалася меркаванне, што ім быў італьянскі архітэктар Санці Гучы, што працаваў пры двары караля [9, с. 81]. З дакументаў Літоўскай метрыкі А. Квітніцкая сцвярджала, што ўдзел ва ўзвядзенні мураванай фары прымаў муляр-італьянец Антоні Дзікрып ці Сцігрып Польскі даследчык Е. Пашэнда на падставе дакументаў з архіваў Ватыкана больш дакладна акрэсліў час узвядзення мураванага касцёла: 1584–1587 гг. Гэтыя храналагічныя рамкі паказваюць, што будаўніцтва гродзенскай фары было распачата ў год заканчэння будаўніцтва люблінскага касцёла езуітаў і завершана ў год пачатку будаўніцтва нясвіжскага касцёла езуітаў. Характэрна, што ў будаўніцтве абодвух азначаных святыняў прымаў удзел архітэктар-італьянец манах-езуіт Д.-М. Бернардоні, запрошаны ў Нясвіж з Рыма князем М.-К. Радзівілам Сіроткам. На нашу думку, стварэнне ў камені новага аблічча старажытнай фары Вітаўта па загаду Стэфана Баторыя было яго першай архітэктурнай справай на беларускай зямлі.




*Іл. 2. Фара Вітаўта. З гравюры Гродна 1600 г.*

У 1984 г. у архіўных сховішчах Украіны беларускім гісторыкам Г. Галенчанка была выяўлена калекцыя чарцяжоў канца XVI ст. з Нясвіжа. У далейшым гэтая знаходка атрыбутавана намі як "альбом Бернардоні", паколькі ўтрымлівае праектныя чарцяжы касцёла Божага Цела ордэна езуітаў у Нясвіжы, стваральнікам якога, як дакладна вядома, быў гэты архітэктар [6]. Аднак, ужо на другім аркушы гэтай калекцыі прадстаўлены план мураванага культавага збудавання з надпісам лацінкай: "План касцёла гродзенскага" [19]. Паколькі аўтарам большасці чарцяжоў альбома быў Д.-М. Бернардоні, відавочна, што ён з'яўляецца стваральнікам не толькі касцёла езуітаў у Нясвіжы, але і фарнага ў Гродне, што храналагічна адпавядае прамежку часу паміж яго двума азначанымі раней будаўнічымі аб'ектамі у Любліне і Нясвіжы.

Аўтэнтычную архітэктуру храма можна аналізаваць толькі на падставе параўнання яго праектнага плана, выявы першапачатковага аблічча на гравюры Гродна Т. Макоўскага 1600 г. (*іл. 3*) і абмерных чарцяжоў, выкананых у 1835 г. (*іл. 4*): плана, папярочнага сячэння і паўднёвага бакавога фасада [17]. На праектным і абмерным



*Іл. 3. План гродзенскага фарнага касцёла з альбома Бернардоні*

чарцяжах прадстаўлены планы трохнефавага 8-слуповага храма даволі значных памераў (58,6×23 м), з гранёным выцягнутым прэсбітэрыям, які па шырыні і вышыні адпавядаў цэнтральнаму нефу, з чацверыковым уваходным аб'ёмам і сакрысціяй з паўночнага боку вімы. Паміж графічнымі матэрыяламі ёсць і пэўныя адрозненні, якія сведчаць, што праект не быў рэалізаваны дакладна. У праекце з паўднёвага боку ўваходнага чацверыковага аб'ёма з магутнымі сценамі, якія неслі шмат'ярусную вежу, паказаны амаль такіх жа памераў вялікі лесвічны блок з двухмаршавай лесвіцай (гэты элемент неаднаразова паўтараецца ў "альбоме Бернардоні"). Яшчэ адна лесвіца, круглая ў плане, але не з вітымі ўсходамі, характэрнымі для абарончых збудаванняў, а прамавугольнымі маршамі, характэрнымі для палацаў, размешчана на паўночным баку храма, каля сакрысціі. Абедзве лесвіцы вялі на эмпоры над бакавымі нефамі.

У сваім праекце Бернардоні ўпершыню ў культавым будаўніцтве Беларусі ўвёў распаўсюджаныя ў Італіі маршавыя лесвіцы замест мясцовай гатычнай традыцыі ўзвядзення круглых вежаў з вітымі ўсходамі. У натуры лесвіцы былі размешчаны ў тых жа месцах, але выкананы іначай. Круглыя ў плане вітыя лесвіцы былі ўкампанаваны ў чацверыкі невялікіх памераў. Як можна бачыць на гравюры Т. Макоўскага, лесвічны чацверык на галоўным фасадзе завяршаўся шмат'ярусай круглай вежачкай, ніжэйшай за асноўную. Паводле абмераў, з поўначы да ўваходнага чацверыка быў прыбудаваны прамавугольны аб'ём, які меў, верагодна, кампазіцыйнае прызначэнне з мэтай зрабіць галоўны фасад сіметрычным. На абмерных чарцяжах бачна таксама, што з поўдня да касцёла прылягала прамавугольная ў плане капліца, перакрытая двума самкнутымі купаламі, якая адсутнічае ў праекце і на гравюры.




*Іл. 4. Абмеры 1835 г. былога гродзенскага фарнага касцёла*

Самым цікавым у архітэктоніцы гродзенскага фарнага касцёла, на нашу думку, было тое, што ён меў структуру “протабазілікі”. Цэнтральны неф быў вышэй за бакавыя, але не меў верхняга бакавога асвятлення. Усе тры нефы звонку былі аб’яднаны ў адзіны суцэльны аб’ём і накрыты высокім клінаватым дахам, што адлюстравана на гравюры Т. Макоўскага. Шматсхільны дах гранёнай алтарнай часткі быў крыху ніжэйшы за асноўны, у выніку чаго вышынная дынаміка аб’ёмаў нарастала ад алтара да магутнай шмат’яруснай вежы з фігурным завяршэннем на галоўным фасадзе, якая дамінавала ў кампазіцыі і стварала звыклы для таго часу сілуэт храма. Падобны готыка-рэнесансны тып культавага будынка быў распаўсюджаны ў XVI ст. у дойлідстве не толькі Беларусі, але і Літвы, Польшчы, Чэхіі і шэрагу іншых краін Цэнтральнай Еўропы.

Контрфорсы у гродзенскім фарным касцёле адсутнічаюць, што адлюстроўвае яго рэнесансную стылістыку. Сцены асноўнага аб’ёма, прэсбітэрыя і ніжняга чацверыка вежы мацаваліся глыбокімі пілястрамі, якія ўверсе злучаліся лучковымі аркамі, утвараючы на бакавых фасадах рытмічную рэнесансную аркаду, але з выразнай перавагай вертыкальных прапорцый у параўнанні з італьянскімі ўзорамі. У прасценках паміж пілястрамі размяшчаліся высокія вузкія гатычныя вокны са

стральчатым абрысам, на вежы былі байніцы. Характэрны мастацкі эфект дасягаўся выразным спалучэннем чырвонага колеру адкрытай муроўкі сценаў і белай тынкоўкі дэкаратыўных элементаў, як і ў храмах беларускай готыкі. Пазней будынак быў цалкам атынкаваны. Відавочна, што ў гэтым, адным з самых адметных помнікаў беларускага сакральнага дойлідства, элементы мясцовай готыкі і рэнесанса паўсюдна зніталваны з архітэктурнымі формамі італьянскага паходжання як у архітэктоніцы, так і дэкоры збудавання.

За сваю амаль 400-гадовую гісторыю мураваны гродзенскі фарны касцёл неаднаразова цярпеў ад пажараў (1753, 1762) і карэнным чынам рэканструяваўся. Упершыню быў моцна пашкоджаны падчас акупацыі горада маскоўскім войскам ў 1655–1661 гг. Візітацыя храма 1662 г. паведамляе: “Скляпенні вельмі небяспечныя, у некаторых месцах рухнулі” [12]. У 1782 г. будынак касцёла зноў пацярпеў ад моцнага пажару, які знішчыў верхнія ярусы вежаў. У інвентары 1793 г., напярэдадні апошняга падзелу Рэчы Паспалітай, пазначана, што касцёл “знаходзіцца ў вялікім разбурэнні” [14]. У 1798 г. адбыўся афіцыйны перавод каталіцкай парафіі ў былы касцёл езуітаў св. Францыска Ксаверыя, што ўзведзены на процілеглым баку плошчы. Пасля далучэння краю да Расійскай імперыі зачынены будынак фары ў 1803 г. перададзены праваслаўным, у 1804–1807 гг. у ім праведзены аднаўленчыя работы, пасля чаго храм асвячоны як праваслаўны Сафійскі сабор. Але першая праваслаўная рэканструкцыя ў стылі класіцызма не змяніла істотна архітэктуру былога касцёла, што можна бачыць на малюнку Н. Орды 1867 г. У 1896 г. святыня гарэла чарговы раз. Пры падзенні кроквау абваліліся скляпенні, што дало магчымасць пры новай рэканструкцыі значна панізіць алтарную частку і надаць пабудове кампазіцыйны лад псеўдарускіх цэркваў. У 1896–1898 гг. акадэмік архітэктуры М. М. Чагін перабудоўвае храм ў псеўдарускім стылі [15]. Над дахам пастаўлены пяць цыбулепадобных галовак на тонкіх шыйках, вежа пераўтворана ў званіцу, завершаную высокім шатром. Выразную пластыку рэнесанснай пабудовы здрабнілі бясконцыя броўкі, какошнікі, парэбрыкі і іншыя псеўдарускія дэкаратыўныя элементы.

У 1920 г. храм вернуты каталікам, але ў 1922 г. ён зноў гарэў. У міжваенны перыяд будынак быў прыстасаваны пад гарнізонны касцёл і рэканструяваны: да ранейшай вышыні адбудавана алтарная апсіда, адноўлены высокі кроквенны дах. У такім выглядзе помнік перажыў Другую сусветную вайну. Але ў часы хрушчоўскага вандалізма па рашэнню гродзенскага гарвыканкама “Фара Вітаўта” была ўзарвана. Цяпер на гэтым месцы, на рэштках падмуркаў святыні трагічнага лёсу, усталяваны мемарыяльны знак, вакол якога, на жаль, па-ранейшаму кіпіць клерыкальная варожасць.

1. Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska pod względem historycznym, geograficznym i statystycznym. Warszawa, 1886. T. 4.

2. Bulgak J. i inny. Polska w krajobrazach i zabytkach. Warszawa, 1930. T. 2.

3. Catalogus ecclesiarum et cleri archidioccesis vilnensis. Vilnae, 1936.

4. Paszenda J. Kościoi pojezuicki (farny w Grodnie). *Kultura artystyczna Wielkiego Ksikstwa Litewskiego w epoce baroku*. Warszawa, 1995. S. 191–213.

5. Reweńska W. Miasta i miasteczki w północno-wschodniej Polsce. Wilno, 1938.

6. Габрусь Т. В. Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока. Мінск: Ураджай, 2001. С. 66–68.

7. Габрусь Т. Саборы помняць усё: Готыка і рэнесанс у сакральным дойлідстве Беларусі. Мінск: "Беларусь", 2007. С. 91–93.

8. Габрусь Т. Шматпакутная фара Вітаўта. *Страчаная падчына* / уклад. Габрусь Т. Мінск: Полымя, 1998. С. 71–75.

9. Гардзееў Ю. Магдэбургская Гароднія. Гароднія-Вроцлаў, 2008. С. 80–83.

10. Квитницкая Е. Д. Приходской костел в Гродно. *Проблемы истории архитектуры народов СССР*. Москва, 1977. Вып. 9. С. 30–37.

11. Краўцэвіч А., Трусаў А., Трусаў І. Вяртанне да людзей: Фарны касцёл у Гродне. *Мастацтва*. 1993. № 8. С. 45–51.

12. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў, г. Вільнюс. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 3698. Арк. 10.

13. Мілінкевіч А., Пашэнда Е. Фара Вітаўта з Гродне. *Наш радавод*. Гродна, 1990. С. 180–188.

14. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, г. Гродна. Ф. 259. Воп. 1. Спр. 34. Арк. 12.

15. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, г. Гродна. Ф. 97. Воп. 1. Спр. 587. Арк. 1–6.

16. Раппопорт П. А. Русская архитектура X–XШ вв. *Археология СССР: Свод археологических источников*. Ленинград: Наука, 1982. Вып. Е 1-47. С. 101–104.

17. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў, г. Санкт-Пецярбург. Ф. 1286. Воп.1. Спр. 57. Арк. 16, 19, 21.

18. Старинные гравированные карты и планы XV–XVШ веков. Из собрания ГМИИ им. А. С. Пушкина / сост. Н. М. Борисовская. Москва: Галактика, 1992.

19. Центральна наукова бібліотека Національної академії наук України. АР, 721(589)С. Арк. 2.